**Танін**, А. За боем бой.. / А. Танін // Віцебскі рабочы. — 1987. — 19 мая. — С. 4.

# ЗА БОЕМ БОЙ

Моцныя маразы і мяцеліцы вось ужо некалькі сутак трымалі ў напружанні чыгуначнікаў. Спазняліся паязды, пуці заносіла снегам. Горад дапамагаў людзьмі для падтрымання чыгуначнай каляіны ў спраўным стане.

Нізкіх тэмператур не вытрымала тэхніка: пачасціліся паломкі цеплавозаў. На экстранай нарадзе было вырашана арганізаваць спецыяльную брыгаду, якая працавала б на няпланавых рамонтах. Аднак высветлілася: гільзу дызеля павінен замяняць толькі спецыяліст. Тады слесар па рамонту рухомага саставу Сяргей Іваноў прапанаваў у тэрміновым парадку навучыць гэтай аперацыі людзей брыгады і сам узяўся дапамагчы.

Ніхто не пакідаў рабочага месца, не давёўшы справу да канца. Гэта было падобна на бой. Сяргей, нядаўні воін-інтэрнацыяналіст, як і ў тым памятным баі, за які атрымаў медаль «За адвагу», стаў на самы цяжкі ўчастак.





Непагадзь хутка скончылася, з памяццю аб напружаных днях застаўся загад начальніка дэпо: «За праяўленую асабістую ініцыятыву ў складаных метэаралагічных умовах пры рамонце няпланавых цеплавозаў аб'явіць падзяку і выдаць грашовую прэмію Іванову Сяргею...».

Мы сустрэліся з Сяргеем у дызельным цэху дэпо. Ей хутка, па-армейску прывёў сябе ў парадак і гасцінна запрасіў дамоў. Шлях быў недалёкі. Сяргей жыве побач, на вуліцы, што носіць самую што ні ёсць чыгуначную назву, – Лакаматыўная.

З расказу начальніка аддзела кадраў мы ўжо ведалі, што Сяргей прыйшоў у лакаматыўнае дэпо з сярэдняй школы № 17 у 1980 годзе. Быў залічаны слесарам першага разраду. Затым — служба ў арміі, у абмежаваным кантынгенце савецкіх войск у Дэмакратычнай Рэспубліцы Афганістан. Служыў добра. Вядома прымаўка: «Сапёр памыляецца толькі раз у жыцці». Дык вось там ён навучыўся менавіта гэтай спецыяльнасці. І колькі разоў даводзілася разгадваць «рэбусы» ворага.

Пасля арміі зноў вярнуўся ў родны калектыў, павысіў разрад, быў неаднаразова заахвочаны. І хоць Сяргей лічыцца ўжо класным спецыялістам, да гэтага часу раіцца са сваім першым настаўнікам — майстрам Алегам Купрыянавічам Місурагіным.

Ва ўтульнай кватэры мы слухалі афганскія запісы песень пад гітару. Сяргей расказваў аб рабятах, з якімі служыў. Паказваў запаветныя альбомы, дзе былі вершы аб каханні, аб шчасці, выказванні вядомых палкаводцаў і невядомых аўтараў аб арміі.

Потым прыйшла з работы яго маці, Валянціна Іванаўна. Мы многа фатаграфавалі. Але наступіў момант, калі рукі маці ўзялі ўзнагароду сына. І мы зразумелі, што гэта і ёсць самая лепшая фатаграфія, зробленая ў гэты вечар.

**А. Танін**